Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

*УДК 821.161.3–312.1.09*

# Вяртанне да вытокаў як сімвал неўміручасці

К. В. КУШНАРОВА

У артыкуле разглядаюцца вызначальныя матывы творчасці В. Казько на матэрыяле аповесці “Сказ пра ката, які смяяўся”. Адзначаецца спроба пісьменніка засцерагчы нашчадкаў ад хваробы бяспамяцтва.
**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, жанр, спадчына, тэматыка, матыў, персанаж, знакі-сімвалы.

The article deals with V. Kozko’s determining motives on the material of the story “The Tale of the Cat, who laughed”. His attempt to warn children of oblivion is stated in the article.
**Keywords:** Belarusian Literature, genre, heritage, subject matter, motif, character, symbol signs.

Адзін з найбольш аўтарытэтных даследчыкаў беларускай літаратуры М. Тычына адносіць В. Казько да тыпу пісьменнікаў з “параненым сэрцам”, душу якога загартавалі жыццёвыя выпрабаванні, якому “хапае маральнай трываласці, ён памятае пра сваё прызванне “ўздымаць патоптаныя душы, людскім названнем акрыляць”, урэшце пра жыццёвую патрэбу выказаць тое, чаго не змаглі, не паспелі выказаць папярэднікі, яго пакаленне “дзяцей вайны” [1, с. 89]. Адчуваючы трагічнасць існавання на зямлі, пісьменнік адлюстроўвае пошукі чалавекам тых сіл, што дапамогуць выстаяць і дадуць новы штуршок для руху наперад да лепшай долі.

Асноўны матыў аповесці В. Казько “Сказ пра ката, каторы смяяўся” (2009), які вызначае танальнасць, задае рытм і рэалізуецца ў некалькіх планах тэксту, – гэта вяртанне да вытокаў. Нездарма амаль усе персанажы твора – незалежна ад таго, па сваёй волі яны пайшлі ў свет ці да гэтага іх вымусілі абставіны – выгнаннікі. Вандруе ў маладосці ў пошуках лепшай долі гаспадар, падарожнічаюць сямёра кацянят у надзеі знайсці, дзе прытуліцца і ўратавацца ад холаду. Блукае недзе пад зямлёй крыніца, абураная спробай чалавека закаваць яе ў мармур. Ратуецца на чужыне ад наступстваў чалавечага гаспадарання Цмок. Коціцца па ваколіцах страх, мацуючыся чалавечымі заганамі. І нават тыя, хто не пакідаў Беларусі, застаюцца незапатрабаванымі ў роднай краіне.

Былым выгнаннікам і іх паплечнікам, як гэта здарылася ў гаспадара з коцікам, што прывёў у хаўрус яшчэ і Цмока з іншымі зданямі, і наканавана здзейсніць галоўную справу жыцця – адрадзіць еднасць паміж прыродай і людзьмі, разбурэнне якой пагражае знікненнем усяму чалавецтву. Найбольш паспрыяць гэтаму могуць продкі, памяці пра якіх пісьменнік адводзіць асабліва важнае месца ў жыцці асобы. Не выпадкова сустрэча гаспадара з коцікам адбываецца ў дзень шанавання продкаў – на Дзяды.

У аповесці атрымала свой працяг узнятая яшчэ ў рамане “Бунт незапатрабаванага праху” тэма бунту продкаў, якіх выракліся ці забылі нашчадкі: “Не дарэмна паўсюдна свет пакутуе ад землятрусаў. То бунтуе наша мора, то пнуцца, лічы, з таго свету да нас нашыя продкі, атланты і волаты духу” [2, с. 71]. Продкі не толькі камянямі выпінаюцца з зямлі, але і назіраюць за сваімі нашчадкамі і спрабуюць накіраваць іх у належнае рэчышча, дасылаюць найбольш відушчым знакі, якія кожны павінен растлумачыць самастойна.

Адзін з цэнтральных персанажаў аповесці, гаспадар, атрымлівае тры такія знакі, першы з якіх – гэта магіла бабулі, якую ён адчайна шукае і выпадкова знаходзіць іншую, з падобнай фотакарткай, аднолькавымі датамі жыцця і смерці і нават імем. Згодна з гэтым знакам ён выбірае сабе месца пад пабудову новай хаты.

Другі знак – сямёра кацянят, якія знаходзяць яго жытло сярод холаду ночы. Гаспадар адчувае віну перад сямю продкамі, праз кроў і смерць якіх ён увайшоў у жыццё і перад якімі часта вінаваціўся і прасіў прабачэння. “І па ўсім, гэтыя блізкія яго там пачулі. Усе сямёра. І далі знак, прыслалі сямярых кацянятак – у дзень памінання продкаў. На Дзяды. А абралі ме-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навіта коцікаў мо таму, што ён вінен перад імі" [2, с. 66]. У выніку коцік, які атрымаў мянушку Біч, ратуе гаспадара ад невылечнай хваробы.

Трэці знак – валошкі. "Гэта быў сьлед. І хто б яго не зрабіў, на якіх сузор'ях, сьлед гэты быў цалкам зямны. І ня проста зямны – тубыльскі. Толькі тубылец мог падкінуць яму такую сьціплую, знакавую кветку гэтага куту, гэтага краю. Ключ, ключык яго духу, душы: параднёная назаўсёды з ёй кветка, што адначасова пустазелле ў жыце" [3, с. 84]. Гэты апошні знак дазваляе здзейсніць, магчыма, адзіна важную справу – яднанне чалавека і прыроды, што павінна ўзнавіць даўно парушаную на зямлі раўнавагу, без якой немагчыма жыццё. "Зьбілася раўнавага: чалавек – зямля, зямля – чалавек. І трэба некага мяняць: ці то чалавека, ці то зямлю. Аднаму з гэтых двух трэба як мага хутчэй саступіць, а мо і зусім адысці ў нябыт" [2, с. 65]. Сваю былую сілу, на думку пісьменніка, чалавек здолее знайсці ў мінулым. І выратаванне яго залежыць ад здольнасці зні-таваць у адно старое і новае, бо інакш усіх чакае толькі вечнае забыццё смерці.

Паважлівае стаўленне да папярэднікаў вяртаецца чалавеку праз іх спрыянне і дапамогу з таго свету. У тыя моманты жыцця, калі, здаецца, выйсця ўжо больш няма, а такое часта выпадала на долю гаспадара, памерлыя дапамагаюць яму: "Нехта як рукамі адводзіў і разводзіў яго бяду, мо маці з сястрычкай, перад якімі ён быў у неаплатным даўгу, заступіўшы іх век, мо бабуля, што так упадала па ім пры жыцьці, – сьвяты бязгрэшны анёл-берагун, якому яны перадалі яго" [3, с. 30]. Гаспадар вельмі моцна звязаны са сваімі продкамі, нездарма праз кіламетры і маразы, што аддзялялі яго ад радзімы, ён беспамылкова і выразна адчуў смерць бабулі, што гадавала яго, аберагала.

Увага да спачыўшых продкаў заканамерна прыводзіць чалавека на могілкі, дзе вельмі выразна адчуваецца цесная злучанасць жыцця людзей і прыроды. Гэта выразна праяўляецца праз тое, што параслі яны па-сялянску каржакаватымі дубамі. Гаспадар блукае па могілках у спробе адшукаць бабуліну магілу і зайздросціць заручанасці дрэў і людзей, міжволі прыходзячы да думкі, што гэта "ня дрэвы, а незапатрабаваны прах людзей. Незапатрабаваная і растрачаная прыжыццёвая іх моц. Напамінак і сьведчанне, якімі яны маглі быць, чаго маглі дасягнуць, зьведзеныя да часу, так ніколі і нікому ня яўленыя атланты гэтага краю" [2, с. 63]. І яму мімаволі мроіцца, што "…усё яшчэ перакруціцца, усё яшчэ вернецца. І быць людзям як гэтыя дубы-волаты. Будучыня прарасце з іх незапатрабаванага праху. Дубы на могілках – гэта толькі прадвеснікі іх" [2, с. 63].

Тэма незапатрабаванасці вопыту продкаў цесна звязана з праблемай дарэмна растрачаных сіл, марнасці намаганняў па паляпшэнні свайго жыцця. Найперш яна выяўляецца праз лёс гаспадара, які вымушаны быў зведаць добраахвотнае выгнанніцтва, працуючы на цаліне, на лесапавале ў Сібіры. Нічога добрага з гэтага не атрымалася: лес на хату скралі недзе ў Маскве, а калі праз год прывёз-такі бярвенні на радзіму, усё цалкам праглынулі накладзеныя на яго, як на аднаасобніка, падаткі. На некаторы час гаспадар увогуле развітваецца з марай адбудаваць уласную хату.

Аднавіцца да жыцця і здзейсніць задуманае дапамагла герою атрыманая ім у спадчыну "зацятасць пракаветнага гарапашніка, якую ня ўзяць ні дустам, ні толам, ні атамнай нават бомбай" [2, с. 42]. Жаданне ўкараніцца на зямлі продкаў не пакідае яго ў спакоі. Менавіта яна прымусіла распачаць яшчэ адну будоўлю. Гаспадар не проста ўзводзіць хату, а нібыта аднаўляе сваю долю. Покліч продкаў абуджае героя-сучасніка, дапамагае зноў знайсці сябе і тым самым адрадзіцца да новага жыцця.

Слепата і глухата да знакаў - папярэджанняў прыводзіць людзей да няўвагі і неразумення саміх сябе, ігнаравання патрэб свайго ўнутранага свету. "Вёска, яе душа, ня чула і ня слухала саму сябе, нібыта таксама ацуралася ня толькі свайго цялеснага, зямнога, але і нябеснага паходжаньня і існаваньня" [3, с. 43]. Маральная недасканаласць персанажаў робіць іх безабароннымі перад варожым пранікненнем, што тлумачыцца В. Казько не толькі бяспамяцтвам нашчадкаў, але часам і тым, што побач з людзьмі знаходзяцца нябачныя ці не заўважаныя імі духі, якія здольныя адмоўна паўплываць на наша жыццё. Таму пісьменнік папярэджвае, што трэба заўсёды пільнавацца, каб не падпусціць варожае чалавеку блізка да сваёй душы, сям'і, блізкіх людзей.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Пакутуе ад суроку, што наклалі на яго яшчэ ў дзяцінстве, гаспадар, міжволі выпускаюць блукаць жах вяскоўцы, што прыйшлі падзівіцца на забойства. Пісьменнік папярэджвае аб тым, што жах, які беспакарана творыцца на зямлі, робіцца магчымым дзякуючы раўнадушна-безуважнаму стаўленню чалавека да свайго жыцця. Страх, што жыве ў душы гаспадара, народжаны жаданнем і адмаўленнем Бога. Ён выклікае адчуванне няпэўнасці і хісткасці жыцця, якое страціла апірышча.

Персанажы аповесці не толькі пакутуюць ад неспрыяльных абставін, але некаторыя з іх здольныя на выхад з будзённага плану існавання ў іншыя. Пісьменнік апісвае гэтыя моманты не як нешта неардынарнае, прадвесцем якому з'яўляюцца пэўныя знакі, а хутчэй наадварот. У аповесці такія пераходы перадаюцца нібыта мімаходзь, паміж гаспадарчымі справамі і клопатамі, як пралом у нешта незразумелае і невядомае. Вельмі часта гэтая падзея (правал у невядомае) адбываецца з героем на беразе ракі, калі няўлоўна змяняецца ўсё наваколле, перайначанае "цяжкім наплывам, нарасьцю туга зьбітых стагоддзяў, сьцягнутых у адно непарыўнае і пракаветнае, у непадуладную нікому вечнасьць" [2, с. 51]. Гэтае павуцінне вечнасці дазваляе чалавеку ўбачыць і пазнаць самога сябе так, так, як ніколі не можа атрымацца ў звычайным жыцці.

Будзённасць і шараговасць існавання чалавека на зямлі перарываецца нешматлікімі ўспышкамі-азарэннямі, у якія толькі і можна зразумець, што "чалавек на зямлі, яго жыцьцё – толькі здань і прывід самога сябе. Толькі адвечны, пракавечны і нязбыўна салодкі морак таго, кім і якім ён сябе ўяўляе. Сапраўднае ж у ім адабрана ці ўкрадзена – вымарачана" [3, с. 83]. Таму такімі важнымі з'яўляюцца пошукі чалавекам таго сапраўднага, пракавечнага, што знаходзіцца недзе глыбока ў душы.

Матыў адраджэння былога і знітавання яго з новым праяўляецца і праз цыклічнасць кампазіцыі аповесці, якая пачынаецца з апісання абставін знікнення крынічкі, што дала жыццё рэчцы Пціч, а заканчваецца – аднаўленнем яе. Гэта значыць, у чалавека і чалавецтва ёсць шанц на выратаванне, працяг існавання на зямлі. Але сам аўтар далёкі ад аптымістычных прагнозаў. Усё, здавалася б, выпраўлена – крынічка вяртаецца да сваіх вытокаў. Толькі гаспадар не вызваляецца ад расчараванняў, з трывогай разважаючы над тым "што будзе з гэтай іх новастворанай братчынай – яднаньнем чалавека, зьвера і зданяў. Ці не нараджэнне гэта новага і больш жахлівага зьвера, а не абнаўленне – вяртаньне веры, дабрыні і сумленьня" [3, с. 89]. Песімізм В. Казько выкліканы найперш слепатой і глухатой большасці тых людзей, што не заўважаюць знакаў з таго свету і не разумеюць прароцтваў найбольш відушчых з іх. Пісьменнік папярэджвае, што без беражлівага захавання спадчыны і адвечнай мудрасці продкаў, памяці пра іх немагчыма будучыня народа і чалавецтва наогул.

Спробамі спыніць чалавека на яго пераможным шляху да апакаліпсісу прасякнуты многія творы пісьменніка апошніх гадоў, і гэта выклікана тым, што "В. Казько, магчыма, апошні пасля Я. Брыля, В. Быкава, А. Адамовіча беларускі пісьменнік, які верыць у тое, што мастацкае слова можа змяніць свет. Калі, вядома, яно будзе пачута сучаснікамі. І найперш самімі беларусамі " [1, с. 89]. Застаецца спадзявацца, што папярэджанні будуць пачутыя і сучаснік-беларус затрымаецца над безданню бяспамяцтва і няверʼя, няхай і на самым яе ўскрайчыку. Затрымаецца, каб асэнсаваць сваю гісторыю, запаветы продкаў, самога сябе.

**Літаратура**

1 Тычына, М. Скарга непачутага крыку // Казько В. Бунт незапатрабаванага праху: Раман. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2009. – 340с.

2 Казько, В. Сказ пра ката, каторы сьмяяўся // Дзеяслоў. – 2009. – № 42. – С. 11-84.

3 Казько, В. Сказ пра ката, каторы сьмяяўся // Дзеяслоў. – 2009. – № 43. – С. 15 – 89.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 13.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ